CORE
Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
Provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Васіль СТАРЫЧОНАК**

# МАРФЕМНЫ І СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ АНАЛІЗЫ

## МАРФЕМНЫ АНАЛІЗ

Пры марфемным аналізе вызначаюцца будова слова, якую яно мае ў сучаснай мове. Найменьшай структурнай часткай слова, якая выражае пэўнае лексічнае ці граматычнае значэнне, з'яўляецца марфема (грэч. *morphe* 'форма'). Да марфем адносяць корань і афіксы (лац. *affixus* 'прымацаваны'). Сярод афіксаў вылучаюцца: прыстаўка (або прэфікс), суфікс, канчатак (або флексіюя, постфікс і інтэрфікс.

| Тыпы марфем | | |
|---|---|---|
| Корань | выражае агульнае для роднасных (аднакаранёвых) слоў значэнне | *горад — гарадскі — прыгарад; лета — летні — па-летняму* |
| Прыстаўка | служыць для ўтварэння новых слоў ці граматычных форм слова і знаходзіцца перад коранем ці другой прыстаўкай | *пісаць — напісаць, чытаць — прачытаць, дзед — прадзед, доля — нядоля* |
| Суфікс | служыць для ўтварэння новых слоў ці граматычных форм слова і знаходзіцца пасля кораня ці іншага суфікса | *беларус — беларуска, рака — рэчка, каса — касец, чытаць — чыталі* |
| Канчатак | зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у словазлучэнні або сказе | *халоднае лета — халодныя дні, халоднымі вечарамі* |
| Постфікс | афіксы *-ся (-ца, -цца), -це, -сьці (-сь), -небудзь,* якія знаходзіцца ў слове пасля канчатка ці словаўтваральнага суфікса | *распраніся, пішыце, скажыце, дзесьці, чагосьці, кагосьці, што-небудзь* |
| Інтэрфікс | афікс, што служыць для злучэння марфем у слове (звычайна гэта злучальная галосная) | *часопіс, газабалон, сінякрылы, сенажаць* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры марфемным аналізе неабходна параўноўваць, супастаўляць аднакаранёвыя ці аднолькавыя па структуры словы, што дапамагае правільна вылучыць усе марфемы лексічнай адзінкі. Напрыклад: *прыбярэжны.* Гэта прыметнік, зменнае слова, таму ў ім выдзяляецца канчатак *-ы* (параўн. *прыбярэжная, прыбярэжнае, прыбярэжныя*). Аснова слова *прыбярэжн-* складаецца з кораня *бярэж* (параўн. *бераг, берагавы, беражок*), суфікс *-н-* (параўн. *дарожны, азёрны, школьны*), прыстаўка *пры-* (параўн. *прыдарожны, прыазёрны, прышкольны*). Графічны запіс гэтага слова наступны: *пры- бярэж - н - ы.*

Ёсць выпадкі, калі аднолькавыя па гучанні марфемы адносяцца да розных тыпаў. Напрыклад, слова *вечарам* у розных кантэкставых сітуацыях можа быць і назоўнікам, і прыслоўем. Марфемны склад яго ў залежнасці ад гэтага будзе розным, параўн.: *прыйсці вечар- ам* (калі) і *задаволены гэтым вечар - ам* (чым). У першым выпадку афікс ***–ам*** з'яўляецца суфіксам, у другім – канчаткам.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што гукі, якія абазначаюцца ётавымі літарамі (*е, ё, ю, я*), могуць адносіцца да розных марфем. Таму пры разборы слова па саставу гэту фанетычную асаблівасць трэба адлюстроўваць у графічным запісе. Напрыклад, *раз — збрај — энн - э, пера-шыј- эк, куп-ј- о, страј - ав- ы, салаўј- а, перј - э.*

У абітурыентаў часта ўзнікае пытанне: суфіксам ці прыстаўкай трэба лічыць марфемы *-ць, -ці, -чы* ў неазначальнай форме дзеясловаў. У школьных падручніках апошніх гадоў гэтыя дзеяслоўныя марфемы адносяцца да суфіксаў. Таму ў графічным запісе іх лепш (і больш правільна) абазначаць як суфіксы, а не канчаткі: *чыт-а- ць, пера-ходз-і- ць, уз-рас-ці, ад-пер-ці, бег-чы, бераг-чы.*

Варта помніць, што прыслоўі, дзеепрыслоўі і інфінітывы з'яўляюцца нязменнымі словамі і канчатка ў іх складзе не можа быць: *па-нов-аму, з-бок-у, на-заўтр-а, весел-а, хадз-і-ць, нес-ці, пры-лёг-шы,з-мы-ўшы, бач-ачы, пра-чыт-а-ўшы*. Выдзяленне ў такіх словах нулявога канчатка лічыцца памылкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пэўныя цяжкасці ў навучэнцаў выклікае аналіз зваротных дзеясловаў. Памылкі звычайна назіраюцца пры выдзяленні ў гэтых словах канчаткаў і постфікса *-ся,* які можа пераходзіць у *-ца*, а пасля галосных — у *-цца*. Напрыклад, у словах *раз-віт-а-л-а-ся, на-чыт-аj-у-ся, сустрак-аj-уц- ца, з-бір-аj-э- цца, хвал’-уj-э-цца* постфікс знаходзіцца пасля канчаткаў і перарывае аснову. Не трэба забываць паказваць перарванасць асновы ў графічным запісе слоў. Гэта ж заўвага адносіцца і да аналізу дзеясловаў загаднага ладу. Форма 2-ой асобы множнага ліку ўтвараецца шляхам далучэння да форм 2-ой асобы адзіночнага ліку постфікса *-це*, які далучаецца да канчаткаў *-і, -ы* і перарывае аснову[1]: у- *ліч-ы-це, бяр-ы-це, помн-і-це, люб-і-це.*

* Пры марфемным аналізе рэкамендуецца прытрымлівацца наступнай паслядоўнасці:

1. Указваецца часціна мовы (зменная ці нязменная).
2. Вызначаецца качатак (у тым ліку і нулявы) і аснова.
3. Шляхам падбору аднакаранёвых слоў выдзяляецца корань.
4. Вызначаюцца прыстаўка, суфікс, постфікс (у складаных словах — інтэрфікс).
5. Графічны запіс марфемнага складу слова.

Напрыклад, *па-суседску* — прыслоўе, нязменная часціна мовы, канчатка няма, аснова — *па-суседску*, корань *-сусед- (суседзі, суседні, суседства)* , суфіксы *-ск-* (*суседскі, гарадскі*) і *у (па-малдаўск-у, па-сяброўск-у)*, прыстаўка *па- (паехаць, па-мядзведжаму),* графічны запіс *па-сусед-ск-у*;

*паўнаводны* — прыметнік, зменная часціна мовы, канчатак *-ы*, аснова *паўнаводн-*, карані *паўн-* і *-вод- (паўнагучны, паўнацэнны; вада, водалячэбны, водаварот),* суфікс *-н- (зменны, вольны, маральны),* інтэрфікс (злучальная галосная) *-а-*, графічны запіс *паўн-а-вод-н-ы*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[1] Аўтары некаторых падручнікаў лічаць, што формы загаднага ладу ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў *-ы, -і* і канчатка *-це.* Гл., напрыклад: *Сямешка Л.І, Шкраба І. Р., Бадзевіч З. І.* Курс беларускай мовы. — Мн., 1996. — С. 394.

*недаверлівасць* — назоўнік, зменная часціна мовы, канчатак нулявы, аснова — усё слова, корань *-вер- (вера, вернасць, недавер),* прыстаўкі *не-, да-, (неабдуманы, неадукаваны, дабудаваны),* суфіксы *лів-, -асць (пакутлівы, ветлівы, старасць, любасць)*, графічны запіс не-да-вер-лів-асць□.

**Прывядзём некалькі прыкладаў графічнага запісу марфемнага аналізу*: салом-ін-к-а, крыл-л-е, вуч-ыш-ся, піш-учы, па-герой-ск-у, сінь□, пад-пол-л-е, вы-піс-а-ць, за-чар-ава-н-асць□, ад-бель-ва-нн-е, за-вуш-н-іц-а, куп-а-еш-ся, з-лев-а, вад-а-кач-к-а, пад-асін-ав-ік□, на-радз- і- л - а - ся, ад-дал- яj- уц- ца, са-гн-а-ўшы, за-хвар-э-ўш-ая, сям-ёр-а.***

### *КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ*

1. Чым адрозніваецца корань ад асновы слова?
2. Чаму марфемны аналіз звычайна пачынаюць з канчатка?
3. Суфіксам ці прыстаўкай трэба лічыць марфемы *-ць, -ці, -чы* ў неазначальнай форме дзеясловаў?
4. Назавіце разрады слоў, якія не могуць мець канчаткаў.
5. Што такое нулявы канчатак?

### Трэніровачныя заданні

1. Назавіце аднакаранёвыя словы.

а) вада, вадзяны, вадзіць, абводнены, вадзіца, зводка, вадзіцца, падводны, вадарод, падводзіць, падводка, абводны;

б) нос, пераносіца, насавы, паднос, заносіць, перанос.

2. Выдзеліце карані ў словах *павозка* і *праводка* і прывядзіце ўсе іх літарныя варыянты.

3. Пакажыце марфемнае і семантычнае адрозненні слоў *уперамешку* і *ўперамежку*.

4. У зваротных дзеясловах абазначце постфіксы і канчаткі (калі ёсць).

Мыешся, радавацца, вучыцца, будуецца, сустракаемся, апынулася, хвалюецца, вярнуліся, клапаціцца, здзівіцца, пахіснулася, сагнуцца, насупілася.

5. Спішыце словы і абазначце ў іх канчаткі. Падкрэсліце словы без канчаткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Юнацтва, носяць, праверыць, бразнуўшы, пяём, адзываюцца, каларытныя, далёка, думаць, бярэзнік, забыліся, несучы, па-нямецку, кавалачак, аблілася, упрыгожваецца, вучань.

6. З тэксту выпішыце словы, якія маюць наступны марфемны склад:

а) б) в) г)

Ён выбраўся на ўзлесак ля старой, знаёмай з дзяцінства раскарэкі-грушыны, травяны дол пад якой спрэс абсыпаны свежымі і ўжо гнілаватымі грушамі; безліч іх жаўцела ў пажухлай лістоце. Адсюль ужо добра відаць быў вялізны прасцяг узаранага на зябліва поля. Хведар марудна клыпаў па ўзлеску, усё пазіраючы ўніз, да ручая, дзе ляжаў ягоны сіроцкі надзел... Хведар ішоў, нязграбна шоргаючы пасталамі ў сухім быльняку, але сілы яго ўсё марнелі *(В. Быкаў).*

7. Зрабіце марфемны аналіз наступных слоў.

Падводнік, калоссе, каменячос, косячы, навыкрэсліваць, радуючыся, адбыўшы, насміхаюся, падворак, прыдарожны, размініраваць, напішыце, здзіўляюцца, дабіраліся, прачытаўшы, летапіс, клубнічны, садоўнік, хутка, пяцёра, што-небудзь, любімыя, згарэлая.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Адказы да заданняў**

1. Аднакаранёвымі трэба лічыць наступныя рады слоў:

а) вада, вадзяны, абводнены, вадзіца, вадарод, падводны (які знаходзіцца пад вадой);

вадзіць, зводка, вадзіцца, падводзіць, падводка, падводны (які мае адносіны да падводы), абводны;

б) нос, пераносіца, насавы;

паднос, занасіць, перанос.

2. У слове павозка корань *воз*. Ён можа выступаць у наступных варыянтах: *ваз (вазок, вываз, вазіць), важ (важу), вез (везці, вывезу), вёз (прывёз), вяз (вязу, прывязу).* Варыянтамі кораня *вод* назоўніка *праводка* з’яўляюцца *водж (праводжу), водз (праводзіць), вад (праваднік), вадз*

*(правадзіць), вяд (правяду), важ (праважаты), вадж (ваджэнне), ведз (праведзены), вядз (правядзенне, правядзе), вес (правесці), вя (правяла), вё (правёў).*

3. Прыслоўе *ўперамежку* суадносіцца з дзеясловам *перамежваць* (*мяжа*) і мае значэнне ‘у нейкім пэўным парадку, папераменна чаргуючыся адно з другім’. Прыслоўе *ўперамешку* суадносіцца з дзеясловам *перамяшаць* (*мяшаць*) і азначае ‘у беспарадку, перамяшана’. Падобнае вымаўленне і напісанне гэтых слоў садзейнічае іх змешванню і атаясамліванню.

4. Мыj- эш-ся, радавац- ца, вучыц- ца, будуj- э- цца, сустракаj-эм-ся, апынул-а-ся, хвалюj-э-цца, вярнул- і-ся, клапаціц-ца, здзівіц-ца, пахіснул-а-ся, сагнуц-ца, насупіл-а-ся.

5. Юнацтв-а, носяць, праверыць, бразнуўшы, пя-ём, адзываj-у-цца, каларытн-ыя, далёка, думаць, бярэзнік□, забыл-і-ся, несучы, па-нямецку, кавалачак□, абліл-а-ся, упрыгожваj-э- цца, вучань□.

6. а) травяны, гнілаватымі, лістота, зябліва, сіроцкі, грушына; б) жаўцела, дзяцінства, клыпаў; в) абсыпаны, узаранага; г) марудна, нязграбна, шоргаючы.

7. Пад-вод-н-ік□, калос-с-е, камен-я-чос□, кос-ячы, на-вы-крэсл-іва-ць, рад-уj-учы-ся, ад-бы-ўшы, на-сміх-аj- у-ся, па-двор-ак□, пры-дарож-н-ы, раз-мін-ірава-ць,на-пiш-ы-це, з-дзіў-л’-аj- э-цца, да-бір-а-л-і-ся, пра-чыт-а-ўшы, лет-а-піс□, клубн- іч-н-ы, сад-оў-нік□, хутк-а, пяц-ёр-а, шт-о-небудзь, люб-ім-ыя, з-гар-э-л-ая.

## СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ АНАЛІЗ

Пры словаўтваральным аналізе вытворныя словы разглядаюцца з пункту гледжання іх утварэння. Для гэтага аналізу важна высветліць, ад якога слова непасрэдна ўтворана новае слова, вырашыць пытанне, якое з двух звязаных па сэнсе аднакаранёвых слоў з’яўляецца зыходным, а якое — вытворным (другасным). Звычайна вытворнае слова адрозніваецца ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

утваральнага большай складанасцю сваёй будовы і мае іншае лексічнае значэнне. Словаўтваральны аналіз патрабуе ўважлівых адносін да структуры слова, прадугледжае добрае веданне спосабаў словаўтварэння і словаўтваральных сродкаў.

Нагадаем асноўныя спосабы словаўтварэння.

| **Спосаб** | **Механізм утварэння** | **Прыклады** |
|---|---|---|
| 1.Суфіксальны | пры дапамозе суфіксаў | *малады — маладосць, трактар— трактарыст, ноч — начны, высокі — высока, герой — гераізм, сорам — сарамлівы, нясмелы — нясмела* |
| 2. Прэфіксальны (прыставачны) | пры дапамозе прыставак, якія далучаюцца да ўтваралаьнага слова | *доля — нядоля, унук — праўнук, горад — прыгарад, араць — пераараць, палохаць — запалохаць* |
| 3.Прэфіксальна-суфіксальны | пры дапамозе прыстаўкі і суфікса адначасова | *акно — падаконнік, пара — напарнік, гара — узгорак, бедны — збяднець, мур — падмурак, страха — застрэшак, людскі — па-людску* |
| 4. Бязафіксны (бяссуфіксны, нульсуфіксальныы) | пры дапамозе нулявога суфікса | *стукаць — стук, ціхі — ціш, адлятаць — адлёт, пераказаць — пераказ, белы — бель, страляць — стрэл* |
| 5. Постфіксальны | пры дапамозе постфікса, які далучаецца да цэлага слова | *сустрэць— сустрэцца, вучыць — вучыцца, што — што-небудзь, дзе — дзесьці, калі — калісьці* |
| 6. Асноваскладанне | шляхам складання асноў (звычайна з дапамогай інтэрфіксаў) | *снегапад, пустазелле, звонкагалосы, васьмівугольнік, конегадоўля, ільнозавод* |
| 7. Словаскладанне | шляхам складання цэлых слоў | *бортінжынер, балетмайстар, контрагент, плашч-палатка, магазін-салон, хіт-парад* |
| 8. Зрашчэнне | шляхам зліцця ў адно цэлае кампанентаў | *вечназялёны, шматпавярховы, малаўжывальны, мімаволі* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| | словазлучэння з захаваннем парадку слоў і без змены іх марфемнага складу | |
| 9. Абрэвіяцыя | шляхам аб'яднання усечаных частак або частак і цэлага слова | *ВНУ, БДУ, БелАЗ, ЛіМ, філфак, медсястра, тэракт* |
| 10. Марфолага-сінтаксічны | шляхам пераходу слоў адной часціны мовы ў другую | *дзяжурны (вучань), ранены (салдат), марожанае (мяса), камандзіровачныя (расходы) → дзяжурны, ранены, марожанае, камандзіровачныя* (назоўнік) |
| 11.Лексіка-семантычны | шляхам распаду значэнняў мнагазначнага слова | *апалонік* 'хвастатая лічынка жабы', *апалонік* 'разліўная лыжка', *двор* 'дварышча, панадворак', *двор* 'манарх і яго акружэнне' |

Пры словаўтваральным аналізе неабходна ўлічваць, што далучэнне словаўтваральных сродкаў да асновы можа выклікаць пэўныя змены ў слове:

а) чаргаванне гукаў *(вада — вадзяны, помста — помсціць, мука — мучны, мех — мяшок, дарога — дарожны);*

б) сцяжэнне зычных *(лейбарыст + ск = лейбарысцкі, невук+ ств= невуцтва, ткач+ск= ткацкі, уласнік+ск= уласніцкі);*

в) выпадзенне гукаў *(прыгожы+ств= прыгоства, косць+н= косны);*

г) накладванне гукаў ці марфем *(папуас+ск= папуаскі, таварыш+ск= таварыскі, беларус+ск= беларускі, Мінск+ск= мінскі);*

д) усячэнне асновы *(Навагрудак+ ск= навагрудскі, скрыпка+ ач= скрыпач).*

Словаўтваральны аналіз прадугледжвае ўлік асаблівасцей будовы слова і яго словаўтваральных сувязей з іншымі словамі. Знешне падобныя словы могуць быць утвораны зусім рознымі словаўтваральнымі сродкамі і рознымі спосабамі. Так, прыметнік *сувораўскі* ўтвораны ад прозвішча *Сувораў* пры дапамозе суфікса -*ск*-, а прыметнік *арлоўскі* — ад назвы горада *Арол* пры дапамозе суфікса -*оўск*-. Назоўнік *вечнасць* утвораны ад прыметніка *вечны*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пасрэдствам суфікса -*асць*, а назоўнік *гарачнасць* — ад прыметніка *гарачы* пасрэдствам суфікса -*насць* (слова *гарачны* няма). Прыметнік *прыдарожны* ўтвораны ад прыметніка *дарожны* з дапамогай прыстаўкі *пры*-, а прыметнік *прыбярэжны* — ад назоўніка *бераг* з дапамогай прыстаўкі *пры*- і суфікса -*н*- (слова *бярэжны* няма).

Пры словаўтваральным разборы пэўныя цяжкасці выклікаюць словы тыпу *паднoжжа, узбярэжжа, узбалоцце, падзямелле, падполле, узлессе* і інш. У гэтых словах падоўжаныя зычныя лепш раздзяляць на два гукі (як яны гучаць у маўленні), а самі назоўнікі лічыць прэфіксальна-суфіксальнымі ўтварэннямі (*пад-нож-ж(а), уз-бярэж-ж(а), уз-балоц-ц(е), пад-зямел-л(е), пад-пол-л(е), уз-лес-с(е).* Не трэба лічыць памылкай меркаванне, што падобныя словы ўтварыліся прэфіксальна-бязафіксным спосабам — далучэннем да ўтваральнай асновы прыстаўкі і нулявога суфікса (у старажытнасці — суфікса -*j*- ): *пад-ножж-∅(а), уз-бярэжж-∅(а), уз-балоцц-∅(е)* і інш[2].

* Звычайна словаўтваральны аналіз праводзяць у наступнай паслядоўнасці:

1. Указваецца часціна мовы.

2. Устанаўліваецца зыходнае (утваральнае) слова і яго аснова.

3. Вызначаюцца словаўтваральныя сродкі (прыстаўкі, суфіксы, постфіксы і інш.), пры дапамозе якіх утворана слова.

4. Называецца спосаб словаўтварэння.

5. Робіцца графічны запіс словаўтваральнага аналізу.

Напрыклад: *адзінкавасць* — назоўнік, утвораны ад прыметніка *адзінкавы*, утваральная аснова *адзінкав*-, словаўтваральны сродак — суфікс -*асць*, спосаб словаўтварэння — суфіксальны, графічны запіс: *адзінкав-асць* ← *адзінкавы*;

---

[2] Гл. *Бардовіч А.* Будова слова: Марфемны і словаўтваральны аналізы // Роднае слова. — 1994, № 7-8. — С.78-79; *Рагаўцоў В.* Лінгвістычны конкурс; Нататкі з Рэспубліканскай алімпіяды // Там жа. — С.72.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*скрып* — назоўнік, утвораны ад дзеяслова *скрыпець*, утваральная аснова *скрып (е),* словаўтваральны сродак — нулявы суфікс, спосаб словаўтварэння — бязафіксны, графічны запіс: *скрып ← скрыпець;*

*зрэдку* — прыслоўе, ўтворана ад прыметніка *рэдкі*, утваральная аснова *рэдк-*, словаўтваральныя сродкі — прыстаўка *з-* і суфікс *-у*, спосаб словаўтварэння — прэфіксальна-суфіксальны, графічны запіс: з*рэдку*← *рэдк-і*;

*сувязны* (назоўнік) — назоўнік, ўтвораны ад прыметніка *сувязны (воін)*, утваральнае слова *сувязны* (прыметнік), спосаб словаўтварэння — марфолага-сінтаксічны (у выніку пераходу прыметніка ў назоўнік), графічны запіс: *сувязны← сувязны (воін).*

Варта запомніць, што пры словаўтваральным аналізе (у адрозненне ад марфемнага) указваюцца толькі тыя часткі слова, з дапамогай якіх яно ўтварылася. Таму марфемны і словаўтваральны аналізы ў многіх выпадках не супадаюць. Параўнаем:

| *Марфемны аналіз* | *Словаўтваральны аналіз* |
|---|---|
| бяс-конц-а | бясконц-а (ад *бясконцы*) |
| не-шмат-лік-і | не-шматлікі (ад *шматлікі*) |
| раз-бур-ы-ць | раз-бурыць (ад *бурыць*) |
| раз- дум-а-ць | раз-думаць (ад *думаць*) |
| раз-зброй-ва-ц-ца | раззбройвац-ца (ад *раззбройваць*) |
| стал-ов-ая (*лыжка*) | сталовая (назоўнік) (ад прыметніка *сталовая*) |
| звыш-план-ав-ы | звыш- планавы (ад *планавы*) |

### ***КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ***

1. Чым адрозніваецца формаўтварэнне ад словаўтварэння?

2. Ці могуць словы ўтварацца пры дапамозе канчаткаў?

3. Якімі крытэрыямі вы будзеце карыстацца пры адмежаванні суфіксальнага, прэфіксальнага і прэфіксальна-суфіксальнага спосабаў словаўтварэння?

4. Ці супадаюць марфемны і словаўтваральны аналізы?

5. Асновы якіх часцін мовы выкарыстоўваюцца пры бязафіксным словаўтварэнні?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ЗАДАННІ***

1. У наступных словах вызначце ўтваральную аснову:

Паверх, казачны, навокал, святло, навушнікі, амаральны, чырвань, збяднець, прысвоіць, стук, пералесак, прыдарожны, абнавіць, асцярожнасць, сінь.

2. Выпішыце з тэксту словы, утвораныя а) суфіксальным; б) прэфіксальным; в) прэфіксальна-суфіксальным; г) бязафіксным; постфіксальным спосабамі.

У бязмерную даль вы ляціце, а за вамі, прад вамі — гады .*(М. Багдановіч* Вершы — мае часовыя прыстанішчы, якія будуюць усё жыццё. *(М. Танк)* Куды б цябе ні завяла дарога, не забывай ніколі ты бацькоўскага парога. *(П. Броўка)* На нягоды жыцця не жальцеся, не было б перамог без нягод. *(П. Панчанка)* Я на раздарожжы не зблуджуся і не збочу, каб чакаць падмогі. *(Д. Бічэль-Загнетава)* Як многа ў нас звычайнасці! Як мала ў нас адчайнасці! *(Г. Бураўкін)*

3. Якія варыянты словаўтваральнага аналізу могуць мець наступныя словы?

Невысока, перавыкананне, зацвярдзенне, перавозчык.

4. Зрабіце словаўтваральны аналіз наступных слоў:

Пераказ, падтэкст, падлетак, гасціннасць, гераізм, запалохаць, бель, падмурак, сучасны, лянівы (назоўнік), застрэшак, запалохаць, сарамлівы, пустазелле, нясмела, падполле, па-людску.

**Адказы да заданняў**

1. Паверх (ад верх-), казачны (ад казк-а), навокал (ад вакол), святло (ад свет), навушнікі (ад вух-а), амаральны (ад маральн-ы), чырвань (ад чырвон-ы), збяднець (ад бяднець) прысвоіць (ад свой), стук (ад стукаць), пералесак (ад лес), прыдарожны (ад дарожн-ы), абнавіць (ад нов-ы), асцярожнасць (ад асцярожн-ы), сінь (ад сін-і).

2. Суфіксальны — *часовыя, жыццё, бацькоўскага, многа, звычайнасці, мала, адчайнасці*; прэфіксальны — *бязмерную, нягоды, ніколі; завяла;* прэфіксальна-суфіксальны — *раздарожжы, прыстанішчы*; бязафіксны — *даль*; постфіксальны — *жальцеся, зблуджуся.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Невысока* (суфіксальны спосаб ад *невысокі* і прэфіксальны спосаб ад *высока*), *перавыкананне* (суфіксальны спосаб ад *перавыканаць* і прэфіксальны спосаб ад *выкананне*), *зацвярдзенне* (суфіксальны спосаб ад *зацвярдзець* і прэфіксальны спосаб ад *цвярдзенне*), *перавозчык* (суфіксальны спосаб ад *перавозіць* і прэфіксальны спосаб ад *возчык*).

4. *Пераказ← пераказаць,* нулявы суфікс, бязафіксны спосаб, *падтэкст ← тэкст,* прыстаўка *пад*-, прэфіксальны спосаб, *падлетак← лета,* суфікс-*ак* - і прыстаўка *пад*-, прэфіксальна-суфіксальны спосаб, *гасціннасць ← гасцінны,* суфікс-*асць*, суфіксальны спосаб, *гераізм ← герой,* суфікс -*ізм*, суфіксальны спосаб, *запалохаць ← палохаць,* прыстаўка *за*-, прэфіксальны спосаб, *бель← белы,* нулявы суфікс, бязафіксны спосаб, *падмурак ← мур,* суфікс -*ак* і прыстаўка *пад*-, прэфіксальна-суфіксальны спосаб, *сучасны← час,* суфікс-*н*- і прыстаўка *су*-, прэфіксальна-суфіксальны спосаб, *лянівы ← лянівы* (прыметнік), марфолага-сінтаксічны спосаб — шляхам пераходу слоў адной часціны мовы ў другую, *застрэшак ← страха*, суфікс-*ак* і прыстаўка *за*-, прэфіксальна-суфіксальны спосаб, *запалохаць ← палохаць*, прыстаўка *за*-, прэфіксальны спосаб, *сарамлівы ← сорам,* суфікс-*лів*-, суфіксальны спосаб, *пустазелле← пустое зелле,* інтэрфікс -*а*-, спосаб складання, *нясмела ← нясмелы,* суфікс-*а*, суфіксальны спосаб, *падполле ← пол*, прыстаўка *пад*- і суфікс -*л*-, прэфіксальна-суфіксальны спосаб, *па-людску ← людскі*, прэфікс *па*- і суфікс -*і*, прэфіксальна-суфіксальны спосаб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ